Беларусь.info

№99 14/08/2006

Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.
Марцін Лютэр Кінг

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

Падзеі

Кансерватыўна-хрысціянская партыя БНФ заявіла, што бліжэйшым часам магчымы рэферэндум пра аб'яднанне з Расіяй. Партыя заклікала не ўдзельнічаць у мясцовых выбарах. У заяве, прынятай на сойме партыі гаворыцца пра небяспеку гэтай выбарчай кампаніі. Менавіта на ёй можа быць абвешчаны інкарпаратыўны рэферэндум. Кансерватыўна-хрысціянская партыя заклікала ў дзень галасавання ісці не на выбарчыя ўчасткі, а на вуліцы і плошчы для пратэсту. Рэжым не хавае, што рыхтуе рэферэндум па стварэнні так званай "саюзнай дзяржавы", па прыняцці так званага "канстытуцыйнага акту саюзнай дзяржавы". То бок фактычна -- па ліквідацыі суверэннага статусу Рэспублікі Беларусь.

Нацыянальны камітэт аб'яднаных дэмсілаў рыхтуецца да выбараў. Сёньня ў Менску адбылося паседжаньне Нацыянальнага камітэту аб'яднаных дэмсілаў. Адно з галоўных пытаньняў, якія на ім абмяркоўваліся, – падрыхтоўка да мясцовых выбараў. Нацыянальны камітэт яшчэ раз пацьвердзіў сваю гатовасьць дапамагчы дэмакратычным кандыдатам на мясцовых выбарах. Паводле старшыні Нацыянальнага камітэту Анатоля Лябедзькі, мяркуецца распрацаваць сем рэгіянальных праграм разьвіцьця.

Берасьце: стан здароўя Любові Разановіч лепшае. Удзельніца акцыі пратэсту ўладальнікаў і кіроўцаў маршрутных таксі Любоў Разановіч у Цэнтральным гарадзкім шпіталі Берасьця ўжо шосты дзень праходзіць курс інтэнсіўнай тэрапіі. У інтэрвію нашаму Радыё сёньня яна паведаміла, што стан здароўя зь цяжкага ўзьняўся да ўзроўню сярэдняй ступені цяжкасьці. Аднак пасьля сухой галадоўкі марудна аднаўляюцца некаторыя функцыі арганізму. Штодня спадарыня Разановіч ляжыць пад кропельніцай.

Казулін будзе перапісваць 150 старонак тэксту ад рукі. Палітвязню Аляксандру Казуліну прапанавалі перапісаць судовы пратакол ад рукі. Суд Маскоўскага раёну адмовіўся даць яму і яго адвакатам ксеракопіі пратаколаў. Пратаколы паседжанняў займаюць каля 150 старонак машынапіснага тэксту. Экс-кандыдат на прэзідэнта і яго абаронцы хадайнічалі пра атрыманне іх копіяў і копіяў відэазапісаў, далучаных да справы. Суддзя Тамара Ўнукевіч у сваім адказе не патлумачыла прычынаў адмовы.

МЗС Славаччыны патрабуе вызваліць актывістаў "Партнэрства". Міністэрства замежных спраў Славаччыны сёньня выступіла з адмысловай заявай з нагоды прысуду актывістам "Партнэрства", у якой патрабуе вызваліць усіх асуджаных актывістаў. Нагадаем, што на гэтым тыдні з такімі заявамі ўжо выступілі ЗША і Эўразьвяз.

Абвесткі

Новы конкурс – "Фота Свабоды". "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org